ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 223 (1190) ПЯТНІЦА, 26-га верасьня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90
6 месяцаў	1 р. 80
1 год	3 р. 30

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага № —2 кап.

ДА X ЗЬЕЗДУ КОМСАМОЛУ БЕЛАРУСІ
кожны комсамолец
і ўся працоўная моладзь
выпісвае і чытае газэту
„ЧЫРВОНУЮ ЗЬМЕНУ“

КОНТРРЭВОЛЮЦЫЙНАЯ ЗГРАЯ ЗЬНІШЧАНА

48 ШКОДНІКАЎ РАБОЧАГА ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЯ ПА ПАСТАНОВЕ КОЛЕГІІ АДПУ РАСТРЭЛЕНЫ

ПРЫГАВОР АДПУ--- ЛЕПШЫ ВЫКАЗЬНІК ЖАЛЕЗНАЙ ВОЛІ ПРОЛЕТАРСКІХ МАС

Прыгавор--выкананы

Прыгавор выкананы—так гаворыць паведамленьне калегіі АДПУ—вернага стража інтарэсаў дыктатуры пролетарыяту, грозы ўсіх і ўсякіх контр-рэволюцыянэраў.

Мячом пролетарскай дыктатуры зьнішчана агіднейшая зграя гадаў—контррэволюцыянэраў шкоднікаў.

Рабочая кляса і ўсе працоўныя Савецкага Саюзу, занятыя ўпартым будаўніцтвам, будуючыя пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі новыя і новыя сталёвыя гіганты, перабудоўваючы вёску на соцыялістычны лад,—з вялікім задаволеньнем сустрэнуць гэты прыгавор АДПУ, які зьяўляецца лепшым выказьнікам жалезнай волі пролетарскіх мас.

Клясавы вораг бязьлітасна выціскаецца на ўсіх вучастках нашага будаўніцтва, ліквідуецца на базе суцэльнай колектывізацыі апошняя цьвердыня капіталізму—кулацтва як кляса.

Энэргіяй і воляй рабочай клясы пераможна будуецца соцыялізм, пасьпяхова выконваецца пяцігодка вялікіх работ.

Усё гэта выклікае ліхаманкавае супраціўленьне клясава - варожых элемэнтаў.

Разьбіваемы ў адчыненых бойках клясавы вораг пад рознымі маскамі імкнецца затармазіць, перашкодзіць пасьпяховасьці соцыялістычнага будаўніцтва нашай краіны. У ход пускаюцца самыя агідныя, самыя азьвярэлыя мэтады барацьбы супроць дыктатуры пролетарыяту.

У даным выпадку зграя контррэволюцыянэраў абрала самы важны, самы адчуваемы вучастак.

Фінансуемыя з-за мяжы службі капіталістычнай фірмы „Уніон“ імкнуліся выклікаць незадаволеньне працоўных мас, кастлявою рукою голаду задушыць савецкі Саюз.

Але яны глыбока памыліліся.

У рабочай клясе знайшлося дастаткова сіл для таго, каб выкрыць і зьнішчыць зграю гадаў, рабочая кляса знойдзе сілы для таго, каб залячыць раны, нанесеныя шкоднікамі справе рабочага забясьпечаньня.

Максымум клясавай пільнасьці, умець распазнаць ворага пад маркай спэца, пры ўменьні цаніць адданых справе соцыялістычнага будаўніцтва спэцыялістых, максымальнае ўзмацненьне рабочага кантролю і рашучага высоўваньня рабочых у органы рабочага забясьпечаньня,—вось урокі, якія трэба зрабіць у выніку справы шкоднікаў рабочага забясьпечаньня.

Усе сілы, усю энэргію аддаць справе соцыялістычнага будаўніцтва!

Выканаць пяцігодку ў 4 гады!

Вось пролетарскі адказ працоўных мас на контррэволюцыйныя дзеяньні групы шкоднікаў.

Падрыхтаваць кадры спэцыялістых, кінуць лепшых комсамольцаў на вучастак работы па рабочаму забясьпечаньню.

На поўны ход работу па выкананьню прамфінпляну і мерапрыемстваў колгасна-вытворчага паходу.

Вось наш адказ на контррэволюцыйныя вылазкі.

ПРЫГАВОР КОЛЕГІІ АДПУ

Колегія АДПУ, разгледзеўшы па даручэньню ЦВК Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў і СНК СССР справу аб контр-рэволюцыйнай шкодніцкай організацыі ў галіне забясьпечаньня насельніцтва продуктамі харчаваньня, матар'ялы па якой былі апублікаваны ў „Правде“ ад 22 верасьня 1930 г., пастанавіла:

1. Разанцава Алеся Васілёва, нарадж. 1874 г., профэсара, былога двараніна, былога абшарніка, былога генэрал-майёра, які займаў пасады: члена Праўленьня Цэнтрахладбойні намесьнік старшыні Праўленьня Масхладбойні, 1928 г.—старшыні тэхнічнага савету халадзільнага камітэту пры Наркомгандлю СССР (заснавальнік контррэволюцыйнай організацыі);

2. Каратыгіна Яўгена Сяргеева, нарадж. 1872 г., профэсара, да рэволюцыі які працаваў галоўным рэдактарам „Торгово-промышленной газеты“ і „Вестника финансов“ — органы міністэрства фінансаў, які займаў пры савецкай уладзе шэраг адказных пасад, старшыні сельска-гаспадарчай сэкцыі прампляну ВСНГ СССР, старшыні НПСА Масельпрому ВСНГ СССР і намесьніка старшыні КПС харчовай і сельска-гаспадарчай прамысловасьці пры Накомгандлю СССР (кіраўнік контррэволюцыйнай організацыі);

3. Карпенка Міхася Захарава, нарадж. 1874 г., які займаў пасаду галоўнага інжынэра Хладацэнтру, былога дваранін, былога палкоўніка (організатар шкодніцтва)

4. Варанцова, Міколу Міколава, нарадж. 1882 г.; які займаў пасаду консультанта Наркомгандлю РСФСР па халадзільнай справе, былога дваранін, былога абшарніка (кіраўнік шкодніцтва ў халадзільнай справе);

5. Пятрова Міколу Платонава, нарадж. 1871 г., які займаў пасаду заг консэрвным аддзелам Саюзмяса, былога палкоўніка.

6. Куранава Міколу Андрэева, нарадж. 1879 г., які займаў пасаду намесьніка загадчыка консэрвным аддзелам Саюзмяса, былога дваранін, былога палкоўніка;

7. Дзянісава, Паўла Ігнатава нарадж. 1882 г., які займаў пасаду намесьніка начальніка праўленьня Саюзмяса і галоўнага інжынэра (організатар шкодніцтва);

8. Крашэньнікава Міхася Іванава, нарадж. 1889 г., які займаў пасаду таваразнаўца Саюзмяса, былога афіцэра;

9. Эстрына, Самуіла Грыгорава, нарадж. 1887 г., які займаў пасаду намесьніка начальніка прамкіраўніцтва Саюзмяса (адзін з заснавальнікаў шкодніцкай організацыі);

10. Дардыка Алеся Ісакава, нарадж. 1895 г., які займаў пасаду нам. начальніка кіраўніцтва загатовак і разьмеркаваньня Саюзмяса;

11. Левандоўскага Барыса Абрамава нарадж. 1890 г., які займаў пасаду загадчыка аддзелу збыту і разьмеркаваньня Саюзмяса (організатар шкодніцтва ў мясной справе);

12. Войлашнікава, Адзіва Адрыянава, нарадж. 1877 г., былога меншавіка, які займаў пасаду адказнага выканаўцы Саюзмяса (організатар шкодніцтва ў „Госмяса“).

13. Купчына, Міхася Міколава, нарадж. 1887 г., які займаў пасаду адказнага выканаўцы Саюзмяса;

14. Гінзбурга, Аскара Майсеева, нарадж. 1891 г., які займаў пасаду загадчыка бэконным аддзелам Саюзмяса;

15. Драздова, Васіля Паўлава, нарадж. 1872 г., які займаў пасаду консультанта ТЕУ Саюзмяса (організатар шкодніцтва ў мясной справе);

16. Выхоўскога, Канстанціна Казімірава, нарадж. 1894 г., які займаў пасаду намесьніка ўпаўнаважанага Сібірскай канторы Саюзмяса, былога гвардзейскага афіцэра (кіраўнік шкодніцтвам у канторы Саюзмяса);

17. Сакалова, Юрку Грыгорава, нарадж. 1887 г., які займаў пасаду загадчыка адкормам жывёлы Сібірскай канторы Саюзмяса, былога капітана царскай арміі і начальніка забясьпечаньня арміі Калчака;

18. Сакалова, Сяргея Паўлава, нарадж. 1889 г., які займаў пасаду інспэктара Уральскай канторы Саюзмяса;

19. Вэндта, Карла Мартынава, нарадж. 1881 г., займаўшага пасаду тэхнарука консэрвнай фабрыкі Троіцкага комбінату Саюзмяса, былога ўласьніка консэрвнай фабрыкі;

20. Курыгіна, Міхася Пятровіча, нарадж. 1875 г., займаўшага пасаду тэхнарука па ўбою былага Троіцкага комбінату Саюзмяса;

21. Курачкіна, Канстанціна Алесева, нарадж. 1899 г., займаўшага пасаду загадчыка лябараторыяй Троіцкага комбінату Саюзмяса, былога дваранін а, б. белага афіцэра;

22. Цыхаўскага, Канстанціна Пятрова, нарадж. 1876 г., займаўшага пасаду інжынэра будаўнічага кіраўніцтва Саюзрыбы, б. падпалкоўніка;

23. Язерскага, Анатолія Іванава нарадж. 1890 г., займаўшага пасаду члена праўленьня Саюзрыбы, был га ўпраўляючага рыбнымі промысламі Сапожнікавых (організаваў і кіраваў шкодніцтвам па рыбе ў Саюзрыбе)

24. Фішзона, Ізраіля Майсеева, нарадж. 1892 г., займаўшага пасаду загадчыка плянава-справаздачнай групай Саюзрыбы, былога рыбапрамыслоўцу (кіраўнік контррэволюцыйнай організацыі ў Саюзрыбе);

25. Фішзона, Пятра Майсеева, нарадж. 1886 г., займаўшага пасаду загадчыка эканамічна - організацыйнай групы Інстытуту рыбнай гаспадаркі, былога рыбапрамыслоўцу;

26. Арцыбушава, Міхася Пятрова нарадж. 1884 г., займаўшага пасаду дырэктара Волга-Каспійскага раёну, Саюзрыбы былога дваранін а, былога марскога афіцэра, удзельніка пакараньня сьмерцю рэволюцыйных матросаў у 1905 годзе;

27. Бергамышава, Мікалая Алесева, нарадж. 18?5 г., займаўшага пасаду дырэктара вытворча-тэхнічнага кіраўніцтва Саюзрыбы, былога дваранін а;

28. Баланава, Васіля Васілевіча, нарадж. 1882 г., займаўшага пасаду даверанага экспорт-кіраўніцтва Саюзрыбы, былога рыбапрамыслоўцу (організатар шкодніцтва ў галіне экспорту рыбы);

29. Шпіркана, Віталія Іраклевіча, нарадж. 1887 г., займаўшага пасаду даверанага экспорт-кіраўніцтва Саюзрыбы;

30. Казакова, Міхася Алесева, нарадж. 1880 г., які займаў пасаду консультанта Саюзрыбы, былога дваранін а;

31. Нікіціна, Сяргея Паўлава, нарадж. 1893 г., які займаў пасаду намесьніка старшыні праўленьня Волга-Каспійскага рыбнага трэсту, былога афіцэра-калчакоўца (кіраўнік контррэволюцыйнай організацыі ў Волга-Каспійскім рыбным трэсьце);

32. Каспійцава, Захара Янкава, нарадж. 1880 г., які займаў пасаду адказнага спэцыялістага-рыбніка Армэнгандлю, былога гандляра рыбаю;

33. Галоўкіна, Алеся Ёнава, нарадж. 1888 г., які займаў пасаду адказнага спэцыялістага-рыбніка Армэнгандлю, былога гандляра рыбаю;

34. Цярэшчанка, Кузьму Кірылава, нарадж. 1883 г., які займаў пасаду члена праўленьня Азрыбтрэсту, былога члена ўстаноўчага збору ад правых эсэраў (кіраўнік контррэволюцыйнай організацыі ў Азрыбтрэсьце);

35. Шчарбакова, Сямёна Васілёва, нарадж. 1883 г., які займаў пасаду члена праўленьня Усерыбтрэсту (кіраўнік контррэволюцыйнай організацыі Ўседзяржрыбтрэсту);

36. Рубінштэйна, Якуба Львовіча нар 1891 г., які займаў пасаду члена праўленьня Усядзяржрыбтрэсту, (правадзіў шкодніцтва ў забясьпечаньні рыбай пролетарскіх цэнтраў);

37. Воль-Эпштэйна Леаніда Захарава, нарадж. 1889 г., які займаў пасаду памочніка нач. кіраўніцтва рэалізацыі Саюзрыбы;

38. Талстога, Уладзімера Канстанцінава, нарадж. 1882 г., які займаў пасаду дырэктара паўночнага і Азоўскага раёнаў Саюзрыбы, былога дваранін а (кіраўнік шкодніцтвам па паўночным і Азоўскім рыбным раёнам);

39. Карпава, Пятра Янкава, нарадж. 1875 г., які займаў пасаду тэхнічнага дырэктара трэсту, былога буйнага фабрыканта (організатар шкодніцтва ў вырабу снасьцей);;

40. Абдулаева, Гамдула, нарадж. 1881 г., які займаў у 1928-29 годзе пасаду дырэктара Рыбтрэсту, у апошні час зволенага з гэтай пасады (правадзіў шкодніцтва па Дагестанскім рыбным раёне);

41. Розэнбэрга, Леаніда Самойлавіча, нарадж. 1887 г., займаўшага пасаду тэхнарука проэктнай канторы Саюзконсэрва (кіраваў шкодніцтвам па Саюзконсэрву);

42. Брайлоўскага, Алеся Майсеева, нарадж. 1883 г., займаўшага пасаду намесьніка загадчыка вытворчага кіраўніцтва Саюзплодагародніна (кіраўнік шкодніцтвам у Саюзплодагародніне);

43. Рамановскага, Аляксея Міхайлавіча, нарадж. 1897 г., займаўшага пасаду намесьніка нач. проэктна-будаўнічага кіраўніцтва Саюзплодагароднiна, былога афіцэра;

44. Данцыгера, Льва Самойлавіча, нарадж. 1887 г., былога даверанага румынскай фірмы „Бравэрман“;

45. Казлова, Івана Арсеньевіча, нарадж. 1888 г., займаўшага пасаду адказнага выканаўцы Бэконтрэсту;

46. Рагалева, Алеся Васілевіча нарадж. 1879 г., займаўшага пасаду майстра Троіцкага консэрвнага заводу Саюзмяса, з 1912 па 1920 г. служыў на консэрвным заводзе ангельцаў;

47. Шапашнікава, Стэфана Зьмітрава, нарадж. 1887 г., займаўшага пасаду інжынэра інстытуту рыбнай гаспадаркі, былога ўласьніка халадзільнага прадпрыемства;

48. Фалеева, Ціхона Мікалаева, нарадж. 1889 г., займаўшага пасаду супрацоўніка Дзяржпляну,—як актыўных удзельнікаў шкодніцкай організацыі і незамірных ворагаў Савецкай улады—**РАССТРАЛЯЦЬ.**

Прыгавор выкананы.

Старшыня АДПУ **Менжынскі.**

СССР і Турцыя

Банкет у гонар прыезду міністра Турцыі

МАСКВА, 24. Учора на банкеце ў Народным Камісарыяце Замежных Спраў, наладжаным у гонар міністра Турцыі пана Тэўфік-Рушдзі-бэя, з прывітаньнем выступіў т. Літвінаў.

У сваёй прамове тав. Літвінаў заявіў:

Пан міністар! Я шчасьлівы вітаць вас, паважаны, Тэўфік-Рушдзі-бэй, як міністра замежных спраў таварыскай нам Турцыі, імя якога цесна зьвязана з разьвіцьцём савецка-турэцкай дружбы за апошняе двесяцігодзьдзе.

Мы з вамі добра памятаем той час, калі савецкія рэспублікі і Турцыя гэроічна стрымлівалі вайсковы націск сусьветнага імпэрыялізму, які абрушыўся на народы нашых краін толькі за тое, што яны прынялі рашэньне б даваць сваё жыцьцё вольна, самастойна і бяз якога-б там ні было вонкавага ўмяшаньня. Менавіта ў гэты пэрыод цяжкай і самаадданай барацьбы зарадзілася тая дружба, якая ў далейшым разьвівалася і ўзмацнялася прыняла характар сапраўды цеснага таварыскага супрацоўніцтва.

Гэта супрацоўніцтва вышла за межы непасрэдна савецка-турэцкіх узаемаадносін і зьяўляецца ў сучасны момант важным фактарам сусьветнай політыкі.

Ваш прыезд сюды ў СССР,—гаворыць далей Літвінаў,—дасьць вам, пан міністар, магчымасьць азнаёміцца з тым грандыёзным будаўніцтвам, якое праводжана ажыцьцяўляецца народамі Саюзу і якое само за сябе сьведчыць аб іх няўхільным імкненьні да захаваньня міру. Роўным чынам і Турцыя мае патрэбу ў міры для ажыцьцяўленьня задач унутранага будаўніцтва і выказваю яшчэ раз сваю радасьць з прычыны спатканьня з вамі, пан міністар, у Маскве і ўпэўнен у тым што такі непасрэдны контакт паміж кіраўнікамі замежнай політыкі нашых таварыскіх краін будзе садзейнічаць пасьпяховаму ажыцьцяўленьню нашай задачы, далейшаму замацаваньню савецка-турэцкай дружбы, — магутнага фактару ў справе барацьбы за мір.

Я падымаю свой келіх за савецка-турэцкую дружбу, за прывітаньне турэцкага народу, за галаву турэцкае дзяржавы Газі-Вустапа Кемаля, за старшыню савету міністраў—Ісмэт-пашу, за энэргічнага спаборніка гэтай дружбы, нашага старога сябра — Тэўфік-Рушдзі-бэя.

Пасьля таварыша Літвінава выступіў з прамоваю пан Тэўфік-Рушдзі-бэй.

— Пан народны камісар, міласьцівыя гасудары! Дазвольце мне, перш за ўсё, паважаны пан Літвінаў, выказаць вам тую вялікую радасьць, якую я адчуваю зьвярнуўшыся ў гэтую краіну і знаходзячыся сярод тых, хто зьяўляецца маімі прыяцелямі і прыяцелямі Турцыі.

Саюз Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Турцыя імкнуцца да разьвіцьця і дабрабыту сваіх краін ва ўмовах таго міру, падтрыманьне якога ляжыць у аснове іх політыкі.

Як вы правільна падкрэсьлілі глыбокае значэньне цесных адносін, якія зьвязваюць Савецкі Саюз і Турцыю, бясспрэчна ляжыць у тэй гарантыі, якую ўяўляюць гэтыя адносіны для міру і агульнага супакою. Там, дзе нам прыходзілася абараняць тую справу, якая для нас сьвята, мы, магчыма, не карысталіся аднолькавымі аргумантамі, але нашы канцэпцыі былі аднолькавы, бо яны імкнуліся зьнішчыць з міжнароднага організму атруту вайны.

Пан народны комісар! Я хачу вам яшчэ сказаць, што мы з вялізарнейшай сымпатыяй і ўвагай сочым за тымі патугамі гэтай вялікай суседняй з намі і таварыскай нам краіны, за тымі патугамі, якія вы робіце для ўзьняцьця моральнага і матар'яльнага ўзроўню народаў Саюзу. Гэтым народам я шчасьлівы перадаць праз вас сардэчнае прывітаньне турэцкай нацыі.

Я падымаю мой келіх у гонар турэцка-савецкай дружбы, за здароўе пана старшыні ЦВК СССР—Калініна і старшыні СНК пана Рыкава, за прывітаньне рэспублік Савецкага Саюзу. Я п'ю за здароўе народных камісараў і членаў ЦВК. Я выказваю самыя шчырыя пажаданьні шчасьця аднаму з вядомых заснавальнікаў турэцка-савецкай дружбы, нашаму сябру пану Літвінаву.

1-га кастрычніка—фініш усебеларускаму суцэльнаму чырвонаму абозу

БУДЗЬЦЕ ТВАРЦАМІ ХЛЕБНАГА КОНВЭЕРУ

Дзень ударніка адзначым суцэльным чырвоным абозам і датэрміновым выкананьнем плянаў загатовак

Рашуча біць па носьбітах горшага выгляду правага опортунізму--недааацэнцы палітычнай важнасьці хлеба--і бульбазагатовак

Усім РК ЛКСМБ

Тэлеграма

1-га кастрычніка організоўваецца суцэльны чырвоны абоз хлеба і бульбы. Прымеце актыўны ўдзел у гэтай справе. Зьвяжэцеся з коопэрацыяй.

ЦК ЛКСМБ—РЫНДЗІЧ

Чырвонымі абозамі сустрэнем дзень ударніка

Сыстэме спажывецкай коопэрацыі БССР адведзена сёлета вялізарнае месца ў хлебазагатоўках,—амаль 90 проц. усяго пляну загатовак.

Згодна пляну, за жнівень месяц павінна быць загатоўлена 3 проц. усяго гадовага пляну і за верасень —15 проц.

Даныя аб ходзе хлебазагатовак гавораць аб тым, што на жнівень месячнае заданьне выканана было толькі на 65 проц. Недавыкананьне характарызуецца адсутнасьцю ў раёнах належнай работы, якая-б забясьпечыла пасьпяховы ход хлебазагатовак. Тлумачыцца гэта тым, што раённыя організацыі ня ўсюды давялі пляны да кулацкай гаспадаркі, а то і зусім адбаярваліся ад гэтага, спасылаючыся на тое, што кулакоў у іх няма.

20 дзён верасьня далі вялізарны пералом на хлебазагатоўчым фронце. Так, месячны плян за гэтыя дні выканан на 70 %.

Цэлы шэраг раёнаў за 20 дзён верасьня **выканаў і перавыканаў месячныя пляны. Рагачэўскі раён—на 200 проц., Капыльскі і Брагінскі на 150 проц., Рэчыцкі на 130 проц. і г. д.**

Гадавы плян хлебазагатовак Бязуеўскі сельсавет, (Рэчыцкага раёну) выканаў на 150%, Прыбыткоўскі сельсавет, (Гомельскага раёну)—136%. Унукаўскі сельсавет, (Гомельскі раён) і Дзяміхоўскі с-с (Рэчыцкі раён) гадавыя пляны выканалі на 107%.

Прыведзеныя вышэй лічбовыя даныя ня толькі падцьвярджаюць рэальнасьць плянаў хлебазагатовак, а нават даюць магчымасьць тэрмін выкананьня пляну хлебазагатовак значна скараціць.

Але, побач з гэтым, трэба сказаць, што ў шмат якіх раёнах загатоўчая кампанія стаіць на месцы. Раённыя організацыі спадзяюцца, што хлеб пойдзе самацёкам. Прыклады праваопортуністычнай бязьдзейнасьці ў хлебазагатоўках падаюць Бялыніцкі і Сьвіслацкі раёны. Першы выканаў верасьнёўскі плян хлебазагатовак за 20 дзён на 37 проц., а другі толькі на 28 проц.

Нельга абыйсьці моўчкі і загатоўкі бульбы. Яшчэ дагэтуль загатаўчыя раённыя організацыі ня ўцямілі таго значэньня, якое мае сёлета поўнае і своечасовае выкананьне пляну загатовак бульбы.

Толькі ў адны прамысловыя цэнтры (Масква, Ленінград, Урал) мы павінны адправіць 12 мільёнаў пудоў, замест 6 як у мінулым годзе. Акрамя гэтага, каля 28 мільёнаў пудоў павінна пайсьці на патрэбы нашай прамысловасьці. Кастрычнік месяц зьяўляецца рашаючым у справе загатовак як збожжавых, так і тэхнічных культур. Так, за гэты месяц павінна быць загатоўлена 45 проц. усяго гадавога пляну збожжа і павінна на ўсю шырыню разгарнуцца падрыхтоўка і адпраўка ў рабочыя цэнтры бульбы.

У сувязі з гэтымі задачамі, у адказ на адозву ЦК УсеКП(б), праўленьне Белкоопсаюзу зьвярнулася да ўсіх райспажыўтаварыстваў аб організацыі ў дзень ударніка—1-га кастрычніка чырвоных абозаў з хлебам і бульбай

Гэтае палітычнае мерапрыемства не павінна прайсьці міма комсамолу. Па прыкладу організацыі МЮД'аўскіх чырвоных абозаў, комсамол павінен пераключыць усе свае сілы на дапамогу коопэрацыі ў організацыі суцэльных чырвоных абозаў.

„Ніводнага кілё прыватніку,—усе лішкі дзяржаве. Здачай збожжа дзяржаве ўзмацнім соцыялістычнае будаўніцтва. За суцэльную колектывізацыю і ліквідацыю кулацтва, як клясы",—вось лёзунгі, пад якімі павінна праходзіць організацыя чырвоных абозаў.

Да 1-га кастрычніка засталіся лічаныя дні. Комсамольскія ячэйкі павінны зараз-жа пераключыцца на дапамогу партыі і коопэрацыйным організацыям у організацыі чырвоных абозаў.

Х. Б-к.

ЗДАЎ ЛІШКІ

Колгас імя Калініна, Парыцкага раёну здаў свае лішкі жыта да 1-га верасьня, ня гледзячы на тое, што гэты колгас нядаўна толькі з'організаваўся.

БУСЕЛ ХВЁДАР.

„Я толькі па газэтах чуў..."

Па шмат якіх с.с. Заслаўскага р-ну ўжо абгавораны кантрольныя лічбы па бульбазагатоўках і даведзены да вёсак. У многіх населеных пунктах праца па бульбазагатоўках скончана.

Але праверыўшы на мясцох прыёмачны апарат, памяшканьні для бульбы, грашовыя разьлікі можна пераканацца, што такія як савгас „Комунар", куды будзе здаваць бульбу амаль палова раёну, не падрыхтаваўся.

Савгас ня ведае, як будзе прымацца бульба, хто яе будзе здаваць і калі. Прыёмшчык адзін грошай для разьліку няма. Хата-чытальня ніякай працы не праводзіць і да бульбазагатовак не падрыхтавана. Хатнік, тав. Майсеенка, нават 20-га верасьня ня ведаў, што ўсюды распачата праца па загатоўцы бульбы.

„Я толькі па газэтах чуў, што бульбазагоўкі будуць"—так адказвае хатнік.

Рагачоўская, Нова-Дворская і Шаршуньская ячэйкі ЛКСМБ не падрыхтаваліся.

Трэба колгасу і савгаскай ячэйцы КСМ зараз жа ўзяцца за працу, каб быць гатовымі да прыёму бульбы. Райком комсамолу павінен узварухнуць свае ячэйкі.

Бульба.

„Чытач"



Майсеенка: „Я па газэтах толькі чуў,
Што будуць бульбазагатоўкі.
Няхай так. Я-ж памаўчу,
Я пачытаю толькі.

ОПОРТУНІСТЫМ НЯ МЕСЦА НА ХЛЕБНЫМ ФРОНЦЕ

Хлебазагатоўкі разьвіваюцца нездавальняюча. Ліпеньскі і жнівеньскі пляны ня выкананы. Пералом, які быў намеціўся ў канцы жніўня ня быў замацаваны ў першую дзесяцідзёнку верасьня, і загатоўкі пашлі ўніз.

У чым асноўныя прычыны зрыву пляну ў першыя месяцы кампаніі?

Загатоўчыя організацыі не падрыхтаваліся да хлебнай кампаніі. Пад уплывам посьпехаў бальшавіцкай вясны шырока распаўсюдзіўся погляд, што хлеб сам пацячэ на загатоўчыя пункты, што кулак ня будзе аказваць супраціўленьня, што клясавай барацьбы вакол хлеба ня будзе. Ня гледзячы на шэраг дырэктыў Цэнтральнага Камітэту партыі, у прыватнасьці на пастанову ад 26-га ліпеня, якія патрабавалі мобілізацыі ўсіх сіл вакол хлебазагатовак, рашучай барацьбы з кулаком і спэкулянтам, разгортваньня масавай палітычнай работы на сяле, — опортуністычная стаўка на самацёк ня выжыта дагэтуль.

Ня чым іншым, як простым парушэньнем дырэктыў партыі можна вытлумачыць недавядзеньне ў шэрагу раёнаў пляну загатовак да сяла. У бягучым годзе ўся загатоўчая кампанія пабудавана на прынцыпе пасяленных плянаў, вакол якіх павінны мобілізавацца колгасьнікі і бедныкі й серадпякі аднаінасьнікі. А опортуністыя з загатоўчага апарату да гэтага часу не „пасьпелі" яшчэ давесьці гэтага пляну да сяла, падрываючы тым самым організацыйную аснову загатовак. Больш таго,—у шэрагу раёнаў кулацка-заможныя пласты вёскі не атрымалі цьвёрдых заданьняў на здачу ўсіх сваіх таварных лішкаў.

Опортуністыя, ня зьнятыя яшчэ з загатоўчага апарату, а таксама рад партыйных і савецкіх работнікаў сталі падобнікамі кулака і спэкулянта. Нярэдкі выпадкі, калі мясцовыя організацыі выступаюць на абарону кулака, заяўляючы, што ніякіх лішкаў у кулацкіх гаспадарак няма, што ў данай мясцовасьці наогул кулак адсутнічае.

Такія выпадкі простага падтрыманьня кулака адносна рэдкі, значна часьцей наглядаюцца выпадкі іншага парадку. Кулак хаця і атрымоўвае цьвёрдае заданьне, аднак, выкананьне гэтага заданьня нікім не кантралюецца, і ён бяз усякіх перашкод спэкулюе сваім хлебам, організуе „чорныя абозы", г. зн. масавы вываз хлеба і продаж яго па спэкуляцыйных цэнах.

Такія выпадкі, якія сустракаюцца ў нас даволі часта, зьяўляюцца нічым іншым, як правым опортунізмам на практыцы, падтрымкай нашага клясавага ворага. У паасобных мясцовасьцях справа даходзіла да таго, што сельсаветы выдавалі даведку на права закупкі хлеба, іншымі словамі—імкнуліся абараніць спэкулянта дакументамі савецкай організацыі.

Правая практыка шэрагу мясцовых работнікаў прыносіць вялізарную страту хлебнай кампаніі. Ня кажучы ўжо аб тым, што значныя партыі хлеба пападаюць на прыватны рынак, шкодніцкая работа кулака і спэкулянта адлюстроўваецца на тэмпах здачы хлеба. Адзіналічнік, а часамі і колгасьнік, бачачы кулацкую спэкуляцыю, якая не сустракае адпору, сам пачынае вычакаць, не сьпяшаецца з абмалотам і вывазам хлеба.

Такава падрыўная работа кулака, такавы мэтады клясавай барацьбы вакол хлеба ў бягучым годзе. Замест таго, каб проціпаставіць кулацкай агітацыі масавую палітычную работу, згуртаваць колгасьнікаў і беднату вакол палітычных задач хлебнай кампаніі, загатоўцы па-старому працаваюць „кіраваць" з габінэтаў, абмяжоўваюцца цыркулярамі і загадамі. У выніку ёсьць месцы, дзе камісіі садзейнічаньня хлебазагатоўкам пры сельсаветах нават яшчэ ня створаны; ёсьць камісіі, куды пранік наш клясавы вораг. Большая доля віны за гэта кладзецца на партыйныя організацыі такіх раёнаў.

Мы ўправе патрабаваць зараз ад кожнага партыйца, які працуе на сяле, асаблівай цьвёрдасьці ў пытаньнях хлебазагатовак, дакладнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду. Малейшая памылка на гэтым вучастку наносіць удар па загатоўках. Даволі ўказаць, што ў тых мясцох, дзе паасобныя партыйцы альбо ячэйкі пачынаюць размовы аб „нерэальнасьці" плянаў, аб пераўвялічаных заданьнях і да таго падобныя опортуністычныя разглагольстваваньні, кулак шырока выкарыстоўвае іх і разгортвае кампанію за адмаўленьне ад пляну загатовак.

Прарыў на хлебным фронце павінен быць неадкладна ліквідаваны. Усе сілы павінны быць кінуты на хлебазагатоўкі. Правыя опортуністыя, прымірэнцы, якія схільны разглядаць махровы опортунізм, як дробныя „памылкі", з аднаго боку, і аматары адміністрацыйных загібаў—з другога, павінны атрымаць бальшавіцкі адпор. Работнікі, якія ў сучасных складанейшых умовах ня могуць альбо ня хочуць выконваць дырэктыў партыі, павінны быць убраны з хлебнага фронту. На іх месца трэба кінуць ка р моцных партыйцаў і комсамольцаў, якія здолеюць даць адпор паднятаму галаву кулаку і спэкулянту, разгарнуць масавую палітычную кампанію, згуртаваць колгасьнікаў і беднякоў і серадпякоў адзіналічнікаў вакол палітычных задач кампаніі. Правёўшы не на словах, а на справе гэтыя мерапрыемствы, мы забясьпечым барацьбу за плян хлебазагатовак, разгорнем шырокім фронтам соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ў хлебазагатоўках, выканаем плян кожнага сяла, кожнага раёну і тым самым гадовы плян хлебазагатовак па ўсім Саюзе.

Штэрн.

Хлебазагатоўкі праходзяць здавальняюча

Па Смалявіцкім раёне поўнасьцю выконваецца плян хлебазагатовак. Комсамольцы прымаюць актыўны ўдзел у растлумачальнай кампаніі.

Бедната прымусіла кулакоў здаць свае лішкі хлеба дзяржаве. На сёньнешні дзень мы маем наступныя паказчыкі здачы хлеба:

Мястэчка Смалявічы ўжо здало 18 тон хлеба, вёска Уборка, якая складаецца з 6 двароў, дала 4 тоны. Наогул, па Сьмалявіцкім раёне хлебазагатоўчая кампанія праходзіць здавальняюча.

АЛЕСЬ КАШЭЛЬ.

Бязьдзейная ячэйка

Капыльская міжсаюзная комсамольская ячэйка праходзіць міма такой палітычнай гаспадарчай кампаніі, як хлебазагатоўкі. Сакратар ячэйкі тав. **Гірко** бачыць усё зло ў тым, што няма актыву. Паасобныя комсамольцы гэтай ячэйкі компрамэтуюць сваімі паводзінамі ўсю комсамольскую організацыю.

Вось факт. Комсамолец **Башук** на сходзе па пытаньню хлебнарыхтовак выступіў і заявіў:

— „Даволі нас эксплёатаваць і нагружаць рознай работай. Мы маем сваю асноўную работу, а астатняе нас не датычыцца". Комсамольская ячэйка выступленьне гэтага дзялягі і правага опортуніста не асудзіла і ня прыняла да яго ніякіх захадаў. **Смоткін.**

Поўная бязьдзейнасьць

Большасьць комсамольскіх ячэек Лёзьненскага раёну ў пытаньнях хлебазагатовак і пасеўнай кампаніі праяўляюць поўную бязьдзейнасьць. Некаторыя ячэйкі (колгасаў „1-ае Мая", „Інтэрнацыянал", „Х-ты Кастрычнік" і інш.) лічылі непатрэбным паставіць гэтае пытаньне на сходах ячэек і батрацка-бядняцка-серадняцкай моладзі.

Заданьне раённага камітэту аб тым, каб кожны комсамолец здаў 1 мех хлеба, ні адна ячэйка ня выканала.

Райком павінен зьвярнуць належную ўвагу на ячэйкі, што плятуцца ў хвасьце такой важнай кампаніі, як хлебазагатоўкі. **Комсамолец.**

Да адказнасьці Мазэпу і Гольдзіна!

У Рагачоўскім раёне бульбазагатоўчая кампанія зрываецца. Мы маем абураючыя факты з боку адказных працаўнікоў раённых установаў, якія вылучаны для правядзеньня бульбазагатовак.

Адказны за загатоўкі ад Райколгассаюзу Мазэпа прымусіў колгасьнікаў, якія прывезьлі для нагрузкі бульбу, шукаць дошак, каб забіць вагон і г. д. Няўжо нельга было ўсё гэта падрыхтаваць загадзя, каб потым ня мець тормазу.

Рагачоўскае Гар. С. Т-ва пасылае на раён загатоўцу Гольдзіна, які замест умоўленага 18-га верасьня прапанаваў сялянам прывезьці на станцыю бульбу 21-га верасьня,

Усе гэтыя факты накіраваны на зрыў бульбазагатовак. Трэба прыцягнуць да адказнасьці адзначаных „загатоўцаў".

Брыгадзір „Ч. З." ЯРМАК

ТУПІКІ ДЗІЦЯЧАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Мы пытаем: Дакуль Віцебскі, Гомельскі, Плешчаніцкі, Лёзьненскі і інш. Гаркомы і РК ЛКСМБ будуць прымірэнча адносіцца да яўна праваопортуністычнай недаацэнкі піонэрорганізацый?

Неадкладна: мобілізаваць увагу усёй комсамольскай організацыі на ўзмацненьне кіраўніцтва піонэратрадамі. Даць лепшых комсамольцаў на піонэр-работу. Накіраваць усю ініцыятыву і энэргію піонэраў на выкананьне баявых задач соцбудаўніцтва

Руйнуючы агонь па опортуністычнай недаацэнцы політычнай ролі піонэрорганізацыі

Правады піонэрскай энэргіі ўключыць у соцыялістычнае будаўніцтва

Уся працоўная грамадзкасьць добра памятае задорныя дзіцячыя дэмонстрацыі з катэгорычным запатрабаваньнем палепшыць якасьць продукцыі, зьменшыць брак; ганьбаваньне п'яніц і гультаёў—бацькоў, якія зрываюць бальшавіцкія тэмпы барацьбы за прамфінплян.

Хто не памятае сотні тысяч удумчывых наказаў, у перавыбарчую кампанію саветаў. практычнае дапамогі ў пасьпяховым правядзеньні кампаніі.

Урэшце—калёны за попелам, макулатурай, ломам і г. д.

Можна бясконца адзначаць прыклады політычнай вагі організацыі юных піонэраў у справе соцыялістычнага будаўніцтва.

Першы ўсесаюзны зьлёт ДКА ўзьняў шырокую хвалю зацікаўленасьці працоўнай грамадзкасьці, вакол пытаньняў дзет. ком руху.

Ня было такой ячэйкі, РК, якія-б не абгаварвалі дырэктывы зьлёту, не працавалі-б над вылучэньнем кадраў атраднага піонэр-актыву, над павялічэньнем ахопу ДКА неорганізованай дзетвары і над шэрагам іншых пытаньняў, зьвязаных з палепшаньнем становішча і працы ДКА.

Аднак, паступаючыя з месц матар'ялы з надзвычайнай трывогаю сыгналізуюць аб тым, што становішча піонэр-організацый за апошні час значна пагоршылася. Гэта цалкам і поўнасьцю падцьвярджаецца матар'яламі, ЦК УсеЛКСМ, які цяпер праводзіць агляд ДКА Беларусі.

Дырэктывы Усесаюзнага зьлёту ДКА, а зараз гэта становіцца зусім ясным, не атрымалі ў большасьці пасьлядоўнага і ўпартага ажыцьцяўленьня і падчас застрэлі ў габінэтах РК і былых АК КСМ.

Посьпехі, дасягнутыя мобілізацыяй комсамольска а актыву на піонэрпрацу, у большасьці незамацав ны. Зьмешчаныя сёньня матар'ялы аб абураючых адносінах КСМ кіраўніцтва да становішча ДКА, зьяўляюцца відочнай ілюстрацыяй гэтага.

Недапушчальна паслабілася кіраўніцтва. Частка кіраўнікоў, надзеўшы ружовыя акуляры, ня супраць пакрычаць аб „дасягненьнях“: „узрост у два разы“, „усеагульнае навучаньне“ і інш. Замест энэргічнай працы над вырашэньнем актуальных пытаньняў работы ДКА, ізноў пачынаюць румзаць аб „аб'ектыўных прычынах“, „адсутнасьці актыву“, зацягваюць старую песьню пра „трэцяга сына“ і інш. Вельмі часта зусім нясур'езны падыход да вылучэньня актыву на піонэрпрацу, вадмерная перагрузка. нячулыя да яго адносіны, няўменьне хутка адзначыць месца піонэр-організацыі ў выкананьні бягучых задач партыі і саюзу, уключыць організацыю ў практычную дзейнасьць, падтапіць і дапамагчы, організацыйна аформіць творчую ініцыятыву шырокіх мас дзетвары, стаць на чале яе. Галоўная прычына месьціцца ў політычнай недаацэнцы вагі ДКА ў соцыялістычным будаўніцтве з боку шэрагу камітэтаў і ячэек ЛКСМБ.

Весткі з Віцебску, Гомелю, Лёзьнянску і іншых месц гавораць аб тым, што важнейшыя гаспадарчыя кампаніі, як барацьба за выкананьне прамфінпляну, хлебазагатоўкі, мобілізацыя фін. рэсурсаў, праходзяць бяз удзелу піонэрорганізацыі, што прывяло да развалу піонэратрадаў у Віцебску, Гомелі і інш. мясцох.

Небясьпечнасьць становішча відавочна.

Гэта вымагае ад камітэтаў ячэек зрабіць круты пералом у адносінах да кіраўніцтва піонэрскіх організацый.

З усёй рашучасьцю б'ючы па дзяляцка-опортуністычных адносінах,—па-бальшавіцку выправіць памылкі, прыцягнуўшы піонэр-організацыю і шырокія колы неорганізаванай дзетвары да актыўнага ўдзелу на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва і гэтым самым спыніць развал атрадаў.

Неадкладна прагледзець склад кіруючага піонэр актыву.

Зьняць з працы тых, якія „песьціцца на сонцы“ і чакаюць хутчэйшага ўходу з работы.

Павысіць адказнасьць піонэр-працаўнікоў.

Вылучыць новыя кадры, організаваўшы папярэдня належную іх падрыхтоўку.

Урэшце—больш чуласьці і сур'ёзнага рэагаваньня на паўсядзённыя запатрабаваньні, як піонэрскага актыву, так і самой ДКА.

„Мне некалі, правядзеце самі“

Пры комсамольскай ячэйцы Акргандлю (Гомель) меліся два піонэрскія атрады ў 170 піонэраў. **З прычыны нядбайных, безадказных адносін з боку комсамольскай ячэйкі і піонэр-работнікаў атрады разваліваюцца. Зараз налічваецца ўсяго 70 чалавек піонэраў.**

Піонэрскія атрады на працягу ўсяго летняга часу ня мелі ніякіх плянаў сваёй работы. Да збораў атрадаў піонэр-працаўнікі не рыхтаваліся. Піонэр-працаўнікі зусім бяззуважна адносіліся да работы зьвеньняў і тыя неўзабаве спынілі сваю дзейнасьць.

Піонэраў кормяць сухімі гутаркамі, ня ўцягваюць у практычнае жыцьцё ўстановы, гаспадарча-політычныя кампаніі праходзяць міма піонэрскіх атрадаў. Усё гэта разам узятае выклікае ў старэйшых піонэраў незацікаўленасьць работай піонэрскага атраду. Па передачы старэйшых піонэраў у комсамол не вядзецца аніякай работы.

Піонэр-работнікі занадта часта мяняюцца. За два месяцы ў атрадзе Фінаддзелу зьмянілася 3 важатых. Некаторыя комсамольцы проста ўвільваюць ад піонэр-работы навят не падрываюць. Комсамолец **Хайкін** зрываў піонэрскія зборы. Комсамолец **Лейнаў**, вылучаны бюро ячэйкі на работу ў піонэрскі атрад, за два месяцы нічога не зрабіў, бо нават і ня браўся за работу. Аб усім гэтым бюро комсамольскай ячэйкі ведала.

Прадстаўнікі ад парт. ячэйкі т. т. **Блозман і Гусеў**, вылучаныя для работы ў піонэр-атрадах нічога не зрабілі. Прымацаваны да комсамольскай ячэйкі член партыі **Вапнярскі** ня цікавіўся пытаньнем піонэр-работы.

У грамадзка-політычных кампаніях піонэр-атрады зусім ня ўдзельнічаюць. Быў нават выпадак, калі група піонэраў прышла ў райком і заявіла:—**„Мы бруднай работы выконваць ня будзем ня хочам зьбіраць лом і рызьзе“.**

Комсамольцы ня цікавяцца атрадамі і з іх станам не знаёмы. Калі піонэр-работнікі запрасілі сэкратара ячэйкі — **Пшанічнага—прыйсьці** на піонэр-атрад, ён, як і заўсёды, адказаў:—**„Мне некалі, правядзеце самі“**. Бюро ячэйкі і наогул ячэйка цалкам казённа адносіцца да піонэр-работы Комсамольская ячэйка заслухала справаздачу ў рабоце піонэрскіх атрадаў толькі тады, калі яны разваліліся. Цяпер некаторыя актывістыя з комсамольскай ячэйкі імкнуцца на некага ўскінуць віну за дрэнную работу піонэрскіх атрадаў.

Райкому комсамолу прыдзецца неадкладна праверыць работу піонэрскіх атрадаў і прыцягнуць да адказнасьці тых, хто гэту работу зрываў.

САН.

НА ЗАВОДЫ І ФАБРЫКІ ВІЦЕБСКУ УВАХОД ПІОНЭРАМ ЗАБАРОНЕН

Опортуністычная недаацэнка піонэрорганізацыі з боку некаторых гаспадарнікаў і комсамольскіх ячэек прывяла Віцебскую піонэрорганізацыю да поўнага развалу

Экстраныя зборы піонэр-атрадаў брыгады дзіцячага актыву, сустрэчныя брыгады самаправеркі і, нарэшце, гарадзкая конфэрэнцыя піонэраў гор. Віцебску прызналі, што ў іх дзейнасьці маецца вялікі прарыў Піонэрыя Віцебску нічога не зрабіла ў барацьбе за прамфінплян. Піонэры стаяць у баку ад увядзеньня ўсеагульнага навучаньня і барацьбы за політэхнічную школу.

Такое становішча стварылася ў організацыі ў скутку таго, што комсамольскія колектывы і ячэйкі не кіравалі і ня кіруюць работаю піонэрскіх атрадаў. Сваё кіраўніцтва комсамол перадаў у „концэсыю“ піонэр-работнікам. Важатыя—у большасьці політычна-няпісьменныя, толькі што прашлі ў комсамол. Шмат атрадаў зусім ня маюць піонэр-важатых.

Няўменьне організаваць ініцыятыву і самадзейнасьць піонэраў прывяло да таго, што піонэрскія атрады ня ўдзельнічалі ў гаспадарча політычным жыцьці прадпрыемстваў, **застрэлі на сходах, дакладах.** Партыйныя ячэйкі, фабзаўкомы, гаспадарнікі недаацэньваюць значэньня піонэрскай організацыі, як дапаможніка партыі і комсамолу ў барацьбе за прамфінплян. Аб гэтым яскрава сьведчаць прыведзеныя назоечы факты ў газэце „Чырвоная Зьмена“. **На заводы фабрыкі Віцебску ўваход піонэрам забаронен**

Некалькі фактаў

Вось некалькі прыкладаў з работы піонэрскіх атрадаў па асобных колектывах:

—У колектыве ЛКСМБ МББ чыг. **з 18 атрадаў працуюць толькі два.** З 17 важатых працуюць толькі, важаты і старшыня базы. Некаторыя ня хочуць працаваць, а іншых ячэйкі яшчэ ня вылучылі.

Комсамольскі колектыў не ўцягнуў піонэрскіх атрадаў у барацьбу з прарывам на транспарце.

У колектыве ЛКСМБ ф-кі **„Дзьвіна“** з 248 комсамольцаў ня могуць вылучыць 5 важатых. З-за гэтага ўжо фактычна развалілася піонэрская база, дзе налічвалася каля 5 піонэрскіх атрадаў. Комсамольская ячэйка не дапамагае і ня кіруе работай піонэраў. Атрады ўжо чатыры месяцы бязьдзейнічаюць.

У колектыве будаўнікоў за летні пэрыод зьмянілася 8 важатых. Важатыя атрадамі ня кіруюць. Піонэрскія атрады ня ведаюць плянаў будаўніцтва, піонэры ня ўцягнуты ў практычную работу па выкананьню гэтых плянаў.

У колектыве **ЛКСМБ друкароў ніякай работы** з піонэр-атрадамі не праводзіцца. Ячэйкі ня кіруюць атрадамі. За два месяцы зьмянілася 5 важатых.

Па ячэйцы ЛКСМБ Мэдсанпрацы.

Ужо чатыры месяцы як у піонэрскім атрадзе няма важатага. З боку комсамольскай ячэйкі няма ніякай дапамогі і кіраўніцтва. Атрад трымаецца толькі дзякуючы групе актывістых піонэраў, якія колектыўна замянілі важатага.

Па ячэйцы ЛКСМБ інструмэнтальна-мэблёвай фабрыкі.

У піонэрскія атрады былі вылучаны два важатых: адзін так-сяк працуе, а другі яшчэ ні разу не зьявіўся. Піонэрскі атрад разваліваецца. З 100 чалавек піонэраў на збор прыходзіць чалавек 12. Ячэйка ніякіх захадаў ня прымае каб палепшыць работу атраду.

Па ячэйцы ЛКСМБ Працасьветы.

З 200 піонэраў у атрадзе засталося ня больш **20.** Ячэйка вылучыла аднаго важатага, але ён не наведвае піонэрскага атраду. Піонэры ня ведаюць, хто ў іх важаты. Ячэйка формальна адносіцца да работы піонэрскага атраду.

Віцебскія барабаншчыкі



Ад слоў — да справы

Да суровай адказнасьці зрыўшчыкаў піонэр-работы

Факты аб стане Віцебскай піонэрскай організацыі яскрава сьведчаць нам аб опортуністычнай недаацэнцы піонэр-організацыі, як дапаможніка партыі ў выкананьні баявых задач соцбудаўніцтва. Неабходны рашучы пералом у кіраўніцтве піонэрскімі атрадамі, трэба, не шкадуючы, біць па тых, хто, прыкрываючыся добрымі рэзолюцыямі, формальным вылучэньнем важатых, практычна нічога ня робіць у кіраўніцтве піонэрскімі атрадамі. Прыцягнуць да суровай адказнасьці ўсіх тых, хто зрывае выхаваньне трэцяй зьмены.

А. Прахвацілаў.

Сонейка песьціла Гурвіча,-а...

...піонэратрады Плешчаніцкага раёну разваліліся

Спачатку 1929 году Плешчаніцкі райком комсамолу вылучыў райпіонэр-працаўнікам **Гурвіча А.** Піонэры і некаторыя комсамольцы ўскладалі на Гурвіча, як актыўнага вялікія надзеі. І сапраўды работа паволі наладжвалася. Па раёне было 20 піонэрскіх атрадаў, у якіх налічвалася каля 650 піонэраў. Былі організаваны курсы піонэрпрацаўнікоў,—наогул усё ішло добра.

Але настала лета... Сонейка пачало песьціць Гурвіча, ён пачаў марыць аб хуткім водпуску і... закінуў работу. Увесну піонэры яшчэ нешта рабілі, зьбіралі попел, утыльсыравіну, дапамаглі ў пратручваньні насеньня і г. д., а за летні пэрыод нічога ня было зроблена. Гурвічу павялічылі пэнсыю, каб толькі ён застаўся на рабоце, але нічога не дапагло. Такое становішча было пакуль прыехаў прадстаўнік ЦК ЛКСМБ т. **Рубінчык. Толькі тады РК ЛКСМБ убачыў што ў рабоце піонэр-організацыі—прарыў.**

Збораў атраду ўжо больш як 3 месяцы ня было. Піонэры не дысцыплінаваны. Павадыры закінулі работу ў атрадах. У пытаньнях усеагульнага навучаньня піонэрамі нічога ня зроблена, яны нават самі не наведваюць школы. Комсамольскія ячэйкі зусім ня цікавяцца работай піонэрскіх атрадаў. Ячэйкі абмяжоўваюцца вынясеньнем вымоў важатаму атраду, але ні ў якім разе не практычнай дапамогай.

Самымі лепшымі атрадамі ў раёне лічыліся местачковыя—яўрэйскі і беларускі, але і яны фактычна нічога не рабілі. Беларускі атрад за ўсё лета не правёў ніводнага збору. Піонэр-павадыр базы **Гаўбэс Л.** за ўвесь час сваёй работы нічога не зрабіла.

Гурвіч працягваў сваю бязьдзейнасьць. Райком комсамолу глядзеў на ўсё гэта скрозь пальцы. Толькі цяпер бюро РК ЛКСМБ, разгледзеўшы работу піонэр-працаўніка Гурвіча, абвясьціла яму вымову і зьняла з работы.

Хваёвы.

Я--сэкратар АПО, тэхсэкратар і... піонэр-працаўнік

У Лёзьненскай організацыі больш паловы піонэр-атрадаў зусім ня маюць піонэр-важатых. У атрадах, дзе важатыя ёсьць работа таксама занапала. Важатыя зусім не падрыхтаваны. Комсамольскія ячэйкі на піонэр-работу вылучаюць самых адсталых, неразьвітых комсамольцаў. Піонэр важатым даюцца па некалькі нагрузак і яны ня маюць магчымасьці выконваць сваю асноўную работу.

Райпіонэр-працаўніку даецца па некалькі нагрузак. Вось, напрыклад, я сам будучы піонэр-працаўнікам Лёзьненскага раёну быў перагружаны іншай работай. На працягу двух месяцаў мне аднаму прышлося працаваць і сэкратаром РК ЛКСМБ і АПО і тэх. сэкратаром РК КП(б)Б і піонэр-працаўнікам. Бязумоўна, меўшы чатыры нагрузкі я ні ў якім разе ня мог выконваць сваю асноўную работу.

К. Кароль.

На манэўраных палёх

Вышэй сьцяг ударніцтва!

УСЕ Ў ШЭРАГІ ЎДАРНІКАЎ 3-га ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

Пад такімі лёзунгамі праходзілі манэўры—гэнэральная праверка выкананьня баявога пляну вучобы, агляд клясавай згуртаванасьці і баявой гатоўнасьці часьцей БВА

1. Паходны марш ударнікаў социялістычных тэмпаў

(Ад нашага спэцыяльнага карэспондэнта)

У паходны марш

Бой спыніўся.

Дадзен сыгнал на разбор і перагрупоўку войск...

Ужо пачынала сьвітаць, калі наша Н-ская кавдывізія прыняла сябе ў парадак і рушыла ў паход.

Мы ў дарозе... Ня гледзячы на тое, што мінулай ночы мы амаль ня спалі, дзень нічога ня елі, настрой усіх байцоў вельмі ўзьняты, вясёлы. Дысцыплінаванасьць на поўнай вышыні.

Гучаць песьні, падхопленыя сотнямі галасоў. Моцнае рэха сьпеваў глушыць палявыя прасторы.

Надвор'е добрае.

Вось адзін баец, седзячы на тачанцы, заліхвацка наярвае на гармоніцы частушкі, а таварышы падпяваюць.

Байцы жартуюць, сьмяюцца...

Па-баявому змагаліся

Байцы гутараць аб толькі што прайшоўшых баёх з „сінімі".

— Ну і сыпанулі-ж мы ім каля савгасу М. Так лупілі што ай-я-яй,— хваліцца сваім таварышом чырвонаармеец кулямётнага эскадрону.

— Мы, брат, такса ма працавалі паўдарнаму, як гаворыцца,—заяўляе ў адказ чырвонаармеец сапёрнай каманды.

— Ва ўсю гэта мы пусьціліся за праціўнікам, аж тут разьведка паведамляе, што наперадзе на рацэ мост узарваны. Наша каманда—айда да рэчкі. Прайшло якіх-небудзь 30 хвіл. і часьці ўжо пераходзілі праз два новыя масты, перакінутыя на рацэ С. Пот цурком ліўся, а мы працавалі спаборнічалі...

Ня было часьцей, якія на ляту не пераключаліся-б на ўдарнае выкананьне тае ці іншае новае задачы.

Соцспаборніцтва на хаду

Эскадрон Н-скага кавпалка з раніцы меў задачу быць у рэзэрве. Затым эскадрон атрымоўвае задачу заняць абарончую паласу і адбіваць наступаючую пяхоту „сініх".

Пасьля загаду заняць абарончы рубеж, эскадрон меў 30 хвілін вольнага часу. Гэты час байцы скарысталі для праверкі выкананьня соцдагавору на першую задачу і перазаключэньня дагавору соцспаборніцтва на выкананьне новай задачы—адстаяць рубяжы абароны. Усё гэта было зроблена на хаду. У момант вылучаны па два прадстаўнікі ад узводаў, намечаны пытаньні, узаемна падведзены вынікі. Кароткія абгаварэньні новага дагавору—і дэлегаты ўзводаў па разьдзелах паведамілі байцоў аб пастаўленых соцспаборніцтвам задачах.

У той-жа час па эскадроне было заключана 16 індывідуальных дагавароў на лепшае выяўленьне ініцыятывы і ўпартасьці ў абароне.

Бой з „сінімі" эскадрон правёў паударнаму.

Выканаем вайсковы „прамфінплян"

Байцы кулямётнага эскадрону ў паходным маршы заключылі шэраг дагавароў на социялістычнае спаборніцтва.

Былі прыняты конкрэтныя абавязацельствы:

У дарозе не наяжджаць на каня таварыша, які едзе наперадзе;

Ні аднаго патрона, ні адное кулі ня выпускаць з кулямётнае стужкі, ня бачачы ворага;

Лепш прапрацаваць зварот ЦК УсеКП(б) і на стаянках популярызаваць яе сярод сялян аднаасобнікаў і колгасьнікаў;

Па-баяваму выканаць свой вайсковы „прамфінплян".

Пры такой пастаноўцы справы эскадрон правёў марш вузорна.

Ён з гонарам выканаў узятыя на сябе абавязкі па соцдагавору.

Мы не парушым соцдагавору

— Калі наша №-ская кав. дывізія ўдзельнічала ў начных маршах,—гаворыць ваенкор-ударнік, комсамолец Н., мы ўсе пункты свайго дагавору па социялістычнаму спаборніцтву па-баявому выканалі. Пры зблізкэньні з „праціўнікам" надзвычайна добра захавалі дысцыпліну маршу. Байцы ня шумелі і ня курылі. У людзей ня выкрыта ніводнай засечкі, сярод асабовага складу сьпячых ня было. Узятыя абавязкі ўдарнікі 3-га году пяцігодкі з гонарам выканаюць. Мы не парушым соцдагавору...

Раптам каманда:

— Прывал!

Кухня нахаду пасьпела ўжо зварыць сьвежы абед.

То там, то тут раскінуліся па разьдзелах байцы і уплятаюць сьвежае смачнае варыва і прасяную кашу з маслам.

Ядуць, перакідваюцца жартамі, расказваюць анэкдоты.

Адзін з эскадронаў раскінуўся ля краю лесу.

— Цішыня!—крычыць адзін баец.

На прывале



Чырвонаармейцы за абедам

З натоўпу з блёк-ногам узьнімаецца высокага росту чырвонаармеец—комсамолец В.

—Я станаўлюся ў шэрагі ўдарнікаў

— Я бяру на сябе такія абавязкі.

Дакладна і акуратна выконваць усе даныя мне камандзірамі загады і даручэньні;

Мая вінтоўка ўся іншая баявая зброя ў час манэўраў і пасьля манэўраў будзе ў поўнай спраўнасьці і гатоўнасьці для далейшай справы;

На мясцох стаянак у вёсках і колгасах я ў дапамогу мясцовым організацыям правяду гутаркі аб значэньні Чырвонай арміі і аб социялістычным будаўніцтве;

Бяруся з комсамольцаў стварыць ударныя брыгады для праверкі ходу асеньняй сяўбы і дапамогі мясцовых організацый сем'ям чырвонаармейцаў.

Абавязваюся на днёўцы падрыхтаваць сход колгасьнікаў, паставіўшы пытаньне аб разьмеркаваньні колгаснага ўраджаю, дапамагу стварыць колгасную брыгаду для правядзеньня растлумачальнай працы сярод аднаасобнікаў аб перавазе колектыўнай гаспадаркі.

— Я выклікаю ўсіх стаць ударнікамі 3-га году пяцігодкі

— Я выклікаю ўсіх ударнікаў адзіночак і ўдарныя групы выпрацаваць для сябе прыкладную програму дзеяньняў у манэўравых абставінах, улічыць вопыт манэўровай работы, каб пасьля выйсьці з рацыяналізатарскімі прапановамі па палепшаньню нашай баявой падрыхтоўкі".

У адказ на словы комсамольца—чырвонаармейца В., эскадрон моцна гаркнуў:

— Мы ўсе, як адзін, становімся ў шэрагі ўдарнікаў 3-га году пяцігодкі і прымаем на сябе такія-ж абавязкі.

Так, па ініцыятыве многіх комсамольцаў, падобных на таварыша В. цэлыя часьці абвяшчалі сябе ўдарнымі і па-баявому ў манэўровых абставінах правodзілі работу ў часьцях і сярод насельніцтва раёну манэўраў.

Ал. Адашчык.

23-IX—30 г. раён манэўраў.

Манэўры часьцей БВА скончыліся

Байцы па-ўдарнаму вытрымалі экзамен

Чацьверты дзень манэўраў праходзіў ва ўмовах жорсткіх „баёў" абодвых бакоў. У гэты дзень ад войск патрабавалася: шпаркасьць разгортваньня, рухомасьць і здольнасьць манэўрываваць на полі бою.

„Сінія", меўшыя большасьць сіл, ня сумелі скарыстаць гэтага і посьпеху ня мелі. Чырвоныя часьці паказалі добрыя дзеяньні ў стрэчным баю. І ўмелыя ўпраўленьні.

Своечасовае разгортваньне чырвоных на адным з флангаў дало ім магчымасьць акружыць часьці „сініх" нават пры ўмове добрай работы асобных падраздзелаў „сініх".

Вечарам 22-га верасьня быў дадзен адбой. Часьці разыходзяцца. Адпачынак да параду.

Кароткія вынікі аб манэўрах гавораць, што артылерыя дабілася непарыўнай сувязі са сваёй пяхотай. Падрыхтоўка падраздзяленьняў стралковых часьцей у параўнаньні з мінулым годам надзвычайна ўзьнялася.

Часьці сувязі паказалі сябе згуртаванымі і гатовымі працаваць бяз вучоту часу. Сувязь працавала бесперабою. Хэмпадрыхтоўка значна пасунулася ўперад і супроцьхэмічная абарона пачынае ўкараняцца ў штодзённую работу часьцей.

Хэмічныя часьці паказалі добрую спэцыяльную падрыхтоўку, мабільнасьць дзеяньняў і ініцыятыўнасьць, імкнучыся аказаць дапамогу пяхоце стварэньнем загараджэньняў самастойных і сумесна з сапёрамі.

Станцыі забясьпечаньня раёну загатовак своечасова прадстаўляліся войскам і забясьпечаныя продуктамі давалі поўную магчымасьць чотка працаваць вайсковаму тылу.

Вялікую працу правёў апарат пасрэднікаў, якія працавалі непакладаючы рук, што дало магчымасьць правільна разыгрываць этапы бою і стварыць найбольшую навучыцельнасьць.

Неабходна падкрэсьліць, што ва ўсе дні манэўраў соц спаборніцтва і ўдарніцтва ў часьцях іграла важнейшую ролю і садзейнічала ўздыму інтарэсаў байцоў і манэўраў.

ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмене"

прывітальная тэлеграма

Першая конфэрэнцыя Магілеўшчыны, якая адбываецца ва ўмовах скончанай у асноўным ліквідацыі акругі і сустрэчы трэцяга году пяцігодкі, шле гарачае прывітаньне ЦК комсамолу і рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена".

Конфэрэнцыя запэўнівае, што комсамол Магілеўшчыны мобілізуе творчую ініцыятыву комсамолу і працоўнай моладзі на выкананьне задач пастаўленых партыяй у трэцім годзе пяцігодкі.

Няхай жыве УсеКП(б) і яе правадыр—Ленінскі ЦК.

Няхай жыве ўдарная брыгада-Ленінскі комсамол!

Прэзыдыум конфэрэнцыі.

Паведамленьні

Сёньня, 26-IX 30 г., а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні зялі паседжаньня ФРК КП(б)Б адбудзецца паседжаньне бюро ФРК ЛКСМБ.

Сэкратар РК **Райхэльсон.**

ФРК ДКА склікае на 26 верасьня, а 6 гадз. увечары ў памяшканьні РК нараду важатых фарпостаў школ Фрунзэўскага раёну. **Яўка абавязкова.**

ФРК ДКА.

Адказны рэдактар—Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599